# ДЛЯ АЛІЎЕ І НЕ ТОЛЬКІ...

## Чаму трэба пакаштаваць бераставіцкія яйкі

**Самым першым пытаннем падчас наведвання птушкафабрыкі ў Вялікай Бераставіцы было: вы каштавалі нашу прадукцыю? Прызнаюся, такі пачатак размовы быў нечаканы. Пры сённяшніх даволі разнастайных прапановах цяжка засяродзіцца на чым-небудзь адным. «А вы паспрабуйце! – настойвае дырэктар Міхаіл Груздзеў. – Абавязкова паспрабуйце. Вам спадабаецца».**



Здаецца, звычайны маркетынгавы ход, з якімі спажывец сустракаецца на кожным кроку. Адносіцца да такіх прапаноў можна па-рознаму: хтосьці адмахнецца, а для іншага яна стане падказкай. У любым выпадку, каб скласці сваю думку, варта прыслухацца і самому ацаніць смак прадукту. А можа, і сапраўды гэта слушная прапанова?

Вось на такой хвалі і пачалося знаёмства з кіраўніком аднаго з найбуйнейшых прадпрыемстваў Бераставіцкага раёна. Літаральна праз некалькі гадоў птушкафабрыка адзначыць сваё 60-годдзе. Некаторыя будынкі працуюць да гэтага часу, але прайшлі значную мадэрнізацыю. Інакш нельга: у птушынай гаспадарцы трэба захоўваць максімальную чысціню і выконваць санітарныя нормы.

За гэты час прадпрыемства значна ўзбуйнілася. Калі раней нясушкі размяшчаліся на адным ярусе, дык цяпер іх чатыры. Утрыманне кур-нясушак клетачнае, усе працэсы механізаваны – кармленне, паенне, выдаленне памёту.

Цяпер на прадпрыемстве 150 тысяч пярэстых курачак, якія стабільна выконваюць свой «рабочы» план – штодзень нясуць па яйку. Збор яек адбываецца двойчы ў змену. Жанчыны-птушніцы бяруць іх з канвеернай стужкі і складваюць у латкі. Затым далікатная прадукцыя адпраўляецца ў цэх сарціроўкі. Тут яе размяркоўваюць па катэгорыях – вышэйшая, адборная, першая, другая, яйка дыетычнае, сталовае. Адправедна запаўняюцца вялізныя скрыні на 360 яек. Такіх скрынь за суткі набіраецца да паўтысячы, а часам і 700–800. Рэалізацыя яек – галоўная частка даходу прадпрыемства.

Вядома, расходы таксама значныя – утрыманне птушкі справа нятанная. Большасць сродкаў ідзе на закупку кармоў. Па словах дырэктара, сёлета іх набылі дастаткова, і гэты працэс працягваецца. Таксама два разы на год фабрыка закупляе сутачных курантаў, якія замяняюць асноўны курыны статак. Працэс гэты ідзе паэтапна. Пры замене дарослыя куры рэалізуюцца насельніцтву.

– Кожная перасадка – даволі працаёмісты працэс, – заўважае Міхаіл Іванавіч. – Амаль месяц будучыя «кватэры» праходзяць спецыяльную апрацоўку, чыстку, дэзынфекцыю. Пры неабходнасці вядзецца замена абсталявання ці яго рамонт. У нас цяпер цалкам аднаўлены адзін цэх.

Ёсць, вядома, і свае мінусы – напрыклад, сезоннасць. Заўважана, што попыт зніжаецца летам. Але з такой сітуацыяй сутыкаюцца многія вытворцы, таму яны шукаюць дадатковыя рынкі збыту. Дарэчы, у краіне і сапраўды атрымліваецца больш яек, чым патрабуецца, прычым на 25 %. Гэта значыць, што прадукцыю трэба рэалізоўваць за межамі Беларусі. Бераставіцкая птушкафабрыка, як і многія іншыя, актыўна працуе з расійскімі партнёрамі.

А чым харчуецца птушка? Бо рацыён, як вядома, адбіваецца і на смаку яек. Як паведамілі на фабрыцы, асноўным кампанентам корму з'яўляюцца збожжавыя культуры. Для таго каб нясушка мела добрую энергетыку, у структуру кармлення ўключаюцца такія кампаненты, як вапна, рапсавы алей, шрот, соя, кармавыя дрожджы, ракушнік, таму што з кожным яйкам з арганізмам птушкі вымываецца 20–30 % кальцыю, запасы якога трэба папоўніць.

Птушкафабрыка поўнасцю перайшла на пярэстых нясушак пароды хай-лайн. Раней былі і белыя, але попыт больш схіляўся менавіта да каляровага яйка, таму ў рэшце рэшт яны сталі дамінаваць.

Дзе можна набыць бераставіцкую прадукцыю? У прадпрыемства ёсць свой фірменны гандаль. Дзве крамы знаходзяцца ў Вялікай Бераставіцы, ёсць тры гандлёвыя месцы ў Гродне на Скідзельскім рынку, на міні-рынку новага мікраараёна Альшанка.




Пастаянна выязджае спецыялізаваны аўтамабіль – павільён на колах, які развозіць прадукцыю птушкафабрыкі па вобласці.

На прадпрыемстве, згодна з калектыўным дагаворам, працуе бонусная сістэма для работнікаў. Яны кожны месяц могуць набыць тры латкі яек (90 штук) па сабекошце. Таксама для работнікаў створаны добрыя бытавыя ўмовы, ёсць памяшканне для прыёму ежы з халадзільнікам, мікрахвалевай печкай і нават тэлевізарам. Зарплата таксама нядрэнная – у сярэднім 805 рублёў. Для Бераставіцкага раёна гэта даволі высокі паказчык.

Асноўны кантынгент работнікаў – жанчыны. І, трэба сказаць, многія маюць добрыя вынікі ў працы. Гэта адлюстроўвае і мясцовая Дошка гонару. Дасягненні некаторых работнікаў ушаноўваюцца і на абласным узроўні: сёлета падчас абласных дажынак у Смаргоні аператар птушкафабрыкі Алена Курмель заняла першае месца сярод птушніц Гродзеншчыны.

Дзякуючы такім работнікам, як і многаму іншаму, мы можам атрымаць да свайго стала такую патрэбную прадукцыю. Цяпер я ведаю, якімі яйкамі скарыстаюся, калі буду гатаваць стравы да святочнага стала, – вядома ж, бераставіцкімі!


Алена КУРМЕЛЬ атрымлівае падзяку падчас абласных дажынак.

УНП 500008588

# КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ КАМФОРТ

## У такім кірунку працуюць на Бераставіцкім прадпрыемстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі

**Можна не перабольшваючы сказаць, што без работнікаў камунальнай службы проста нельга ўявіць сабе жыццё цывілізаванага грамадства. Менавіта яны забяспечваюць камфортнае пражыванне і ствараюць спрыяльнае асяроддзе паўсюдна, дзе б ні жыў чалавек. Аб тым, як працуе прадпрыемства ЖКГ Бераставіцкага раёна, расказаў яго дырэктар Віктар Заміроўскі.**


Начальнік Бераставіцкага РУП ЖКГ Віктар ЗАМІРОЎСКІ.

*– Адной з галоўных задач у сферы ЖКГ з'яўляецца цеплазабеспячэнне. Як вы яе вырашаеце?*

– У раёне падачу цяпла забяспечваюць 22 крыніцы. Усе яны падрыхтаваны і стабільна працуюць у асенне-зімовы перыяд. Пасля завяршэння ацяпляльнага сезона ўсе кацельныя праходзяць праверку і, пры неабходнасці, уключаюцца ў планавы ці капітальны рамонт. Летась мы правялі мадэрнізацыю кацельнай у вёсцы Лясная, дзе замянілі агрэгаты на аўтаматыку.

Штогод стаіць задача замяніць не менш за 4 % цеплавых сетак, і мы з гэтым спраўляемся. Летась такая работа праведзена ў некалькіх аграгарадках і раённым цэнтры. Гэта дазволіла значна знізіць страты цяпла. А ўсяго ў раёне 80 кіламетраў цеплатрасы, якая забяспечвае спажыўцоў цеплавой энергіяй.

*– Што робіць жыллёвая гаспадарка, каб даць жыхарам якасную пітную ваду?*

– Як вядома, у краіне стаіць задача да 2025 года забяспечыць спажыўцоў якаснай пітной вадой. На гэта накіравана і наша дзейнасць. Трэба сказаць, што пэўныя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены. Літаральна нядаўна ў аграгарадку Масаляны ўведзена станцыя абезжалезвання магутнасцю 150 кубічных метраў у суткі. Гэты аб'ект жыхары даўно чакалі. Летась такія ж станцыі здадзены яшчэ ў двух аграгарадках.

*– На якія праблемы будзе звернута ўвага ў найбліжэйшы час?*

– Трэба паляпшаць сітуацыю з водаправодам, які перадаецца ад іншых арганізацый. Нядаўна мы прынялі на свой баланс пяць кіламетраў водаправодных і дзесяць кіламетраў каналізацыйных сетак. Зразумела, што многія знаходзяцца ў даволі дрэнным стане. Таму будзем займацца іх заменай.

Вялікі аб'ём работ у сувязі з гэтым трэба выканаць у аграгарадку Пагранічны. У паўднёвай частцы, дзе водаправод належаў Баранавіцкаму аддзяленню чыгункі, свідравіна і воданапорная вежа эксплуатуюцца з 50-х гадоў, іх знос склаў 70 %. Мы прынялі іх на свой баланс, будзем рабіць тры новыя артэзіянскія свідравіны і новую вежу, а таксама мяняць дзесяць кіламетраў водаправода. Цяпер вядзецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі. Займаемся таксама аўтаматызацыяй асобных працэсаў. У прыватнасці, у аграгарадках на аўтаматыку пераводзяцца каналізацыйна-помпавыя станцыі, што спрыяе як зніжэнню затрат, так і паляпшэнню якасці абслугоўвання.

***– Дарэчы, пра затраты. Для спажыўцоў важна, каб кошт паслуг не вельмі біў па кашальку. Разам з тым вам таксама трэба існаваць, развівацца. Якім чынам дасягаецца кампраміс?***

– Мы пайшлі па шляху зніжэння сабекошту паслуг. Складзена цэлая праграма. Адным з кірункаў стаў новы від дзейнасці – будаўніцтва. На прадпрыемстве з'явіўся і новы ўчастак – рамонтна-будаўнічы, які атрымаў неабходныя атэстаты для выканання даволі значнай колькасці будаўніча-мантажных работ. Таксама заняліся і рэалізацыяй будаўнічых матэрыялаў.

Уласнымі сіламі адрамантавалі адміністрацыйны будынак, кабінет аховы працы, абсталявалі гардэроб, душавыя, пакой для яды і яшчэ некаторыя памяшканні. Працуем і на іншых аб'ектах. Напрыклад, у Вялікай Бераставіцы здзейснілі пілотны праект па рамонце парылкі ў лазні, дзе выкарысталі новыя тэхналогіі і ўстанавілі новае пячное абсталяванне. Таксама правялі капітальны рамонт 18-кватэрнага дома ў вёсцы Лясная.



Для зручнасці спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг створана структурнае падраздзяленне па рабоце з кліентамі сэрвісу 115, якое ўключае разліковую групу, пашпартыста, а таксама адзіную дыспетчарскую службу.

***– Віктар Часлававіч, вы згадалі пра кабінет аховы працы, а як увогуле на прадпрыемстве сочаць за тым, каб працаваць без здарэнняў?***

– Асаблівую ўвагу мы звяртаем на аб'екты павышанай небяспекі. Нядаўна на базе прадпрыемства прайшоў раённы дзень аховы працы, падчас якога спецыялісты наведалі некалькі кацельных. Так, у аграгарадку Алекшыцы была прадэманстравана правільная тэхнічная эксплуатацыя высокаэкаэфектыўнага катла, які працуе на драўляных трэсках. Таксама звярталі ўвагу на патрабаванні па складзіраванні і захоўванні мясцовых відаў паліва. Нашы спецыялісты пастаянна праходзяць інструктаж пры рабоце на праезджай частцы дарогі. Тут вельмі важна правільна паставіць дарожныя знакі, праверыць наяўнасць газу ў калодзежы і бяспечна выканаць неабходныя работы.


Работнікі ЖКГ падчас раённага дня аховы працы.

Фота Бераставіцкага РУП ЖКГ.

УНП 500020708

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Маргарыта УШКЕВІЧ.